УДК 811.161.3`42:821.161.3-96:070

# АСНОЎНЫЯ ПРАБЛЕМЫ CREATIVE NON-FICTION ПРАЗ ПРЫЗМУ ЛІТАРАТУРАЗНАЎЧАГА ДЫСКУРСУ

*Новік Ганна Юр'еўна*
старшы навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы, НАНБ; кандыдат філалагічных навук
(г. Мінск, Рэспубліка Беларусь)

*У артыкуле акрэслены найбольш актуальныя праблемы крэатыўнай нон-фікшн літаратуры (мастацкай журналістыкі, тэкстаў-верфабул). Праведзены параўнальны аналіз здабыткаў навукі пра мастацтва слова, якія закранаюць creative non-fiction.*

У сучасных рэаліях на фоне імклівага ўкаранення і эстэтызацыі новых культурных кодаў значна вырасла колькасць разнастайных крыніц інфармацыі. Разам з гэтым на змену самакаштоўнасці ідэй і ведаў прыйшла запатрабаванасць забаўляльнага кантэнту. Адной з такіх крыніц, поруч з інтэрнэт-рэсурсамі, тэлешоў, таблоідамі і інш., выступае creative non-fiction. Тэксты-верфабулы прызначаны для данясення інфармацыі ў такім фармаце, які б мог зацікавіць шырокае кола рэцыпіентаў незалежна ад іх узроставай катэгорыі, сацыяльнага статуса, перакананняў і г.д. Тым не менш спецыфічная "спрошчанасць" і забаўляльнасць самі па сабе не гарантуюць крэатыўнай нон-фікшн шырокай распаўсюджанасці. Дагэтуль рэгулятарам колькасці такіх твораў выступаюць трэнды кніжнага рынку. Немалаважную ролю адыгрываюць запыты на такую літаратуру, якія паступаюць з розных сфер сацыяльнай дзейнасці.

Літаратуразнаўцы краін Захаду пры вывучэнні адметнасцей твораў-верфабул нярэдка разглядаюць апошнія праз прызму журналістыкі, а таксама пэўных адукацыйных стандартаў. Такое бачанне дазваляе прасачыць гісторыю станаўлення creative non-fiction як новага тыпу пісьма, акрэсліўшы нюансы яе практычнага прызначэння. Утылітарнымі ж мэтамі тлумачыцца і фармат літаратуразнаўчых работ. Паколькі меркаванай аўдыторыяй такіх тэкстаў значацца пераважна студэнты і пісьменнікі-пачаткоўцы, то ў большасці кніг/артыкулаў прадэманстраваны комплексны падыход да вывучэння з'явы, а не дасканалае даследаванне асобных праблем у яе межах. Нярэдка літаратуразнаўчыя тэксты ствараюцца ў фармаце крэатыўнай нон-фікшн прозы, што дазваляе рэцыпіентам не толькі азнаёміцца з тэарэтычнымі напрацоўкамі, але і адсачыць спецыфіку прымянення тых ці іншых прыёмаў на практыцы.

Бясспрэчную каштоўнасць для даследчыкаў верфабул уяўляюць кнігі Лі Гаткінда – заснавальніка часопіса Creative Nonfiction. Адна з першых тэарэтычных работ навукоўца – The art of Creative Nonfiction: Writing and Selling the Literature of Reality (1997) – прысвечана **праблеме легітымізацыі** новага тыпу пісьма. У ёй акрэслены адметнасці станаўлення амерыканскай наратыўнай дакументалістыкі, шляхі яе папулярызацыі іператварэння ў спецыфічны брэнд. Лі Гаткінд прапанаваў шэраг рэкамендацый, карысных для аўтараў-пачаткоўцаў (напрыклад, акрэсліў спосабы верыфікацыі фактаў і камунікацыі з выдаўцамі/агентамі), тым самым вызначыўшы перспектыўнасць развіцця гэтага напрамку творчасці.

На ўзбагачэнне метадалогіі даследавання верфабул паўплывала і наступная работа Лі Гаткінда – A Million Little Choices: The ABCs of CNF (2006) – гласарый, які змяшчае шэраг мініэсэ. Праз некаторы час пасля з'яўлення ў часопісе работа была перавыдадзена ў фармаце кнігі пад назвай Keep It Real: Everything You Need to Know About Researching and Writing Creative Nonfiction (2009). Кожны з фрагментаў прысвечаны асобнай актуальнай праблеме: **эвалюцыі крэатыўнай нон-**

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**фікшн, яе ўплыву на чытачоў, аўтарскаму пункту гледжання, суб'ектыўнасці, юрыдычнай адказнасці выдаўцоў, пацверджанню крыніц** і г.д. Разам з тым прысутнічае разгляд даволі спецыфічных паняццяў – "пагружэнне", "рамка" і г.д. – і даследаванне наратыўнай дакументалістыкі праз прызму іншых сфер дзейнасці. Напрыклад, праведзены паралелі з працай вудзяроў: калі тыя не могуць злавіць рыбу традыцыйным шляхам, то раскідваюць нераты ў ціхіх бухтах, каб выцягнуць улоў з марскога дна. "Здабыча" аўтараў creative non-fiction нярэдка дастаецца аналагічным шляхам. Пісьменнікі "апускаюць свае сеткі, каб даведацца больш пра тое, што хаваецца пад паверхняй прадмета" [1, с.38], як трапна адзначыў Лі Гаткінд. Дзякуючы такім супастаўленням, у чытачоў мініэсэ элімінуецца ўяўленне пра стварэнне крэатыўнай нон-фікшн выключна як мастацкую дзейнасць, паколькі ў ёй есць элемент "рамесніцтва", і здабыча патрэбнага матэрыялу нярэдка патрабуе ад аўтараў пераўвасаблення і выканання неўласцівых функцый.

Нягледзячы на вялікую колькасць тэматычных даследаванняў, у замежнай навуцы пра мастацтва слова дагэтуль актуальнай выступае **праблема часу ўзнікнення** крэатыўнай нон-фікшн прозы, а таксама вытокаў гэтай з'явы. Лі Гаткінд і многія яго паслядоўнікі вызначылі "новы журналізм" як імпульс для развіцця creative nonfiction, а ў якасці кропкі адліку яе станаўлення прапанавалі разглядаць пачатак 1990-х. "За апошнія пяць год creative non-fiction відавочна ператварылася ў агульнапрыняты спосаб апісання таго, што становіцца найбольш важным і папулярным жанрам у літаратурным свеце зараз" [2, с. 7], – сцвярджаў Лі Гаткінд у 1997 г. Праз амаль два дзесяцігоддзі навукоўцы значна пашырылі ўяўленне пра часавыя межы. Так, Кэлі Класн у артыкуле American Creative Nonfiction: background and history (2015) аргументавала тэзіс, што станаўленне крэатыўнай нон-фікшн літаратуры на тэрыторыі Амерыкі адбылося ў XVII стагоддзі, а другая палова XX ст. з'яўляецца толькі часам узнікнення новых форм, у тым ліку літаратурнай журналістыкі; crime novels; аповедаў пра хваробы, харчовую культуру; сабачых мемуараў; даследаванняў турэмнага побыту.

На думку стваральнікаў часопіса Creative Nonfiction, часам узнікнення новага тыпу пісьма варта лічыць дату заснавання выдання – 1993 год. Менавіта ён пазначаны ў якасці кропкі адліку ў хроніцы Great (& Not So Great) Moments in Creative Nonfiction (2010), якая ахоплівае 17 год з гісторыі існавання "чацвёртага жанру" і адлюстроўвае трансфармацыю з'явы ў асобны жанр, а таксама ператварэнне ў папулярны і прыбытковы сектар выдавецкай індустрыі. Чытачам прапанаваны фактычна таймлайн, складзены з падзей рознага тыпу: выхаду кніг creative non-fiction ці нават пачатку напісання твораў, узнагароджанняў такіх тэкстаў прэстыжнымі літаратурнымі прэміямі і г.д. Дзякуючы адсутнасці высноў, неаднолькавай значнасці згаданых у падзей, пазнакі ў якасці аўтара ўсіх супрацоўнікаў выдання хроніка прэтэндуе на праўдзівасць і аб'ектыўнасць, дазваляючы чытачу самастойна прааналізаваць спецыфіку паступовага ўкаранення крэатыўнай нон-фікшн прозы ў абсяг амерыканскай літаратуры.

Каштоўнай пры стварэнні цэласнай канцэпцыі creative nonfiction можа падацца кніга Narrating from the Archive (2010) Марка Кодба. У ёй аўтар закрануў **праблему крыніц інфармацыі,** якія задзейнічаюцца пры напісанні верфабул. У прыватнасці, у фокус увагі даследчыка трапілі архівы, бібліятэкі; акцэнт быў зроблены на творчай метадалогіі асобных аўтараў, а таксама эвалюцыі і адметнасцях жанру т.зв. архіўнага рамана.

**Этычным аспектам,** актуальным пры напісанні наратыўнай дакументалістыкі, прысвечаны артыкул The Ethics of Writing Creative Nonfiction (2012) Дэйва Худа. Адштурхоўваючыся ад дэанталогіі журналістыкі, агульных паняццяў маралі і псіхалогіі, даследчык акрэсліў асновы прафесійнай этыкі пісьменнікаў creative non-fiction, у адпаведнасці з якой чытач абавязкова павінны быць папярэджаны пра ўсе аберацыі ад праўдзівага выкладу матэрыялу, калі іх наяўнасць непазбежна прадугледжана канцэпцыяй твора.

**Праблеме карэляцыі ў межах крэатыўнай нон-фікшн розных відаў дзейнасці, асветленай праз прызму педагогікі,** прысвечана мноства дапаможнікаў, якія ствараліся з пачатку XX стагоддзя і вызначаюцца лапідарнасцю, канцэнтраванай інфарматыўнасцю. Сярод такіх работ можна адзначыць Creative Nonfiction: Researching and Crafting Stories of Real Life (2004) Філіпа Джэрарда, дзе кожны фрагмент з'яўляецца фактычна ілюстрацыяй тэхнікі напісання твораў-верфабул. З кнігі Art and Responsibility of Creative Nonfiction Writing (2007) Лі Гаткінда пачаткоўцы могуць даведацца пра нюансы выбару правакацыйных тэм, аптымальныя метады даследавання, спосабы выбудовы структуры твора і г.д. Для навучэнцаў каледжаў і ўніверсітэтаў прызначана кніга Keywords in creative writing (2006) Вэндзі Бішап і Дэвіда Старкі. Увазе чытацкай аўдыторыі прадстаўлена каля 40 канцэпцый, якія закранаюць розныя аспекты крэатыўнай нон-фікшн літаратуры.

Як заўважна, у замежным літаратуразнаўстве закранаецца шырокі спектр праблем, звязаных з вывучэннем верфабул. Зварот даследчыкаў да комплекснага падыходу тлумачыцца перадусім прагматычным складнікам: такія работы прызначаны не толькі для папулярызацыі крэатыўнай нон-фікшн, але і для навучання, а таксама абслугоўваюць камерцыйную сферу.

Для параўнання, у краінах СНД дагэтуль дамінуе перакладная creative non-fiction. Узнікненне арыгінальных ўзораў такой літаратуры на беларускай глебе не з'яўляецца распаўсюджанай з'явай. Гэта тлумачыцца перадусім спецыфікай айчыннага кнігавыдавецкага рынку, складанасцю стварэння тэкстаў-верфабул, а часам і цяжкасцямі доступу да крыніц інфармацыі. Колькасць даследаванняў крэатыўнай нон-фікшн у славянамоўным літаратуразнаўстве покуль што невялікая. Пераважна гэта артыкулы, асноўная мэта якіх – легалізацыя статуса creative non-fiction ці якія змяшчаюць толькі згадкі пра з'яву, якая на Захадзе ўжо лічыцца нечым большым, чым чацвёрты жанр прыгожага пісьменства.

Найбольш грунтоўная спроба легітымацыі паняцця ў літаратуразнаўстве краін СНД ажыццёўлена ў артыкуле "Искусство факта. Понятие «креатив-нон-фикшн»" (2011) А. А. Гвоздзева. Як і многія папярэднікі, А. Гвоздзеў вызначыў мэтазгоднасць успрымання крэатыўнай нон-фікшн як трэнда, які дэтэрмінаваў развіццё адпаведнай галіны кніжнага рынку ў ЗША. Значная ўвага ў артыкуле нададзена **праблеме вызначэння жанраў у межах creative non-fiction.** Сярод найбольш распаўсюджаных навукоўца назваў травелог, біяграфію, псеўдааўтабіяграфіі, навукпоп, сэлфхэлп, крымінальную нон-фікшн, гастранамічны раман, псеўдадакументалістыку; субжанры "гісторыя рэчы/ідэі/з'явы/месца".

Даследаванню твораў-верфабул прысвечаны артыкул "Креатив-нон-фикшн: о некоторых особенностях перевода с датского языка современной нехудожественной прозы" (2020) Г. К. Арловай. Навукоўца абгрунтавала мэтазгоднасць прымянення ў дачыненні да крэатыўнай нон-фікшн тых жа метадаў і сродкаў аналізу, што і да мастацкай прозы.

Нарэшце, існуе шэраг работ, у якіх няма грунтоўнага даследавання тых ці іншых з'яў, звязаных непасрэдна з крэатыўнай нон-фікшн, аднак прысутнічаюць спробы легітымацыі тэрміна. Так, у артыкулах "Роман нон-фикшн как жанр журналистики" (2012) С. А. Бозрыкавай і "Тенденції розвитку травелогу в Інтернеті: між «креатив-нон-фікшн» і «наївною» словесністю" (2018) А. У. Юферавай тэксты-верфабулы выступаюць толькі ў якасці ілюстрацыйнага матэрыялу пры вывучэнні праблем сучаснай публіцыстыкі і трэвел-блогаў. Тым не менш creative non-fiction вызначаецца як папулярная зараз форма творчасці, якая мае патэнцыял да ўвасаблення ў якасці жанра ці наджанравага ўтварэння.

Такім чынам, ацэньваючы ўнёсак замежнага літаратуразнаўства ў вывучэнне крэатыўнай нон-фікшн прозы, варта падкрэсліць шырыню спектра праблем, закранутых навукоўцамі. Акрамя высвятлення дыферэнцыйных адметнасцей, даследчыкі нярэдка надаюць увагу рода-відавай прыналежнасці верфабул, часу ўзнікнення creative non-fiction як паўнавартаснага феномена, разнавіднасцям крыніц інфармацыі і іх праўдзівасці, этычным аспектам пры напісанні верфабул, сінтэзу відаў дзейнасці ў межах крэатыўнай нон-фікшн і г.д. Айчынная ж навука пра мастацтва слова, гэтаксама як і літаратуразнаўства іншых славянамоўных краін, дагэтуль знаходзіцца на шляху фарміравання ўяўлення пра creative nonfiction і вывучэння асобных яе аспектаў. У сувязі з гэтым на дадзеным этапе верагоднай бачыцца далейшая апрапрыяцыя дасягненняў літаратуразнаўства Захаду, дзякуючы якой магчыма дыверсіфікаваць метадалагічныя падыходы да вывучэння здабыткаў сусветнага і айчыннага мастацтва слова.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

## Спіс выкарыстанай літаратуры


1. Gutkind, L. Keep It Real: Everything You Need to Know About Researching and Writing Creative Nonfiction / L. Gutkind. – W. W. Norton & Company, 2009. – 170 p.
2. Gutkind, L. The Art of Creative Nonfiction: Writing and Selling the Literature of Reality / L. Gutkind. – Wiley Books for Writers Series, 1997. – 211 p.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова